УДК 811.161.3=133.1

А.Д. Цеплякова

ФРАНКАМОЎНЫЯ ЗАПАЗЫЧАННІ КРЫЛАТЫХ СЛОЎ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ (КОЛЬКАСНЫ СКЛАД І КРЫНІЦЫ ПАХОДЖАННЯ)

У артыкуле вызначаюцца колькасны склад і крыніцы паходжання франкамоўных запазычанняў крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове. Крыніцы паходжання крылатых слоў размяжоўваюцца на адзінкавыя (першасныя і другасныя) і комплексныя. Першасныя крыніцы паходжання маюць толькі франкамоўныя запазычанні крылатых слоў з уласна французскіх крыніц. Да гэтых крыніц адносяцца літаратурныя тэксты (мастацкія, эпісталярныя, публіцыстычныя, філасофскія творы і тэксты музычных твораў), фальклорныя творы, тэксты масавай камунікацыі, назвы твораў мастацтва, выказванні знакамітых асоб (ці людзей з іх асяроддзя), мянушкі вядомых асоб і літаратурных герояў. Другасныя крыніцы (тэксты вуснай гутарковай мовы, літаратурныя творы, выказванні знакамітых асоб і мянушкі вядомых асоб і літаратурных герояў) садзейнічалі ўзнікненню крылатасці тых ці іншых выразаў з уласна французскіх і іншых першакрыніц. Комплексныя (дзве і больш) крыніцы прадстаўлены трыма дыяхранічнымі мадэлямі: «уласна французскія + няўласна французскія», «уласна французскія + няўласна французскія (больш за 1)», «няўласна французскія (больш за 1) + уласна французскія».

Уводзіны

Крылатыя словы, якія ўжываюцца ў сучаснай беларускай літаратурнай мове, паходзяць як з уласна беларускіх [1], так і з іншамоўных крыніц [2; 3]. Пэўная колькасць іншамоўных запазычанняў крылатых слоў у беларускай мове трапіла ў яе з французскай мовы. Франкамоўныя запазычанні крылатых слоў у беларускай мове спецыяльна не вывучаліся, акрамя спробы іх лексікаграфічнай рэпрэзентацыі ў тлумачальным слоўніку «Крылатыя выразы ў беларускай мове» (2004) пад рэдакцыяй Я.Я. Іванова [2].

Мэтай гэтага артыкула з'яўляецца ўдакладненне колькаснага складу франкамоўных запазычанняў крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове, вызначэнне іх моўнага генезісу і дыферэнцыяцыя паводле крыніц іх паходжання.

1. Колькасны склад франкамоўных запазычанняў крылатых слоў. Агульная колькасць франкамоўных запазычанняў крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове складае каля 150 адзінак. Яны паходзяць як з уласна французскіх, так і з іншых крыніц.

Крылатых слоў з уласна французскіх крыніц налічваецца 137 адзінак. З іх у тлумачальным слоўніку крылатых выразаў пад рэдакцыяй Я.Я. Іванова зафіксавана 27 адзінак, у «Этымалагічным слоўніку фразеалагізмаў» (2004) І.Я. Лепешава – 4 адзінкі. У выніку праведзенага аналізу тэкстаў розных функцыянальных стыляў мы вылучылі шляхам франтальнай выбаркі яшчэ 106 адзінак, шырокае ўжыванне якіх у сучаснай беларускай літаратурнай мове пацвярджаецца шматлікімі прыкладамі.

Крылатых слоў, якія трапілі, на наш погляд, у беларускую мову праз французскую, налічваецца 12 адзінак, з іх 5 зафіксавана ў слоўніку крылатых выразаў пад рэдакцыяй Я.Я. Іванова [2], 2 – у «Этымалагічным слоўніку фразеалагізмаў» (2004) І.Я. Лепешава і яшчэ 5 вызначана паводле праведзенага намі аналізу тэкстаў рознай функцыянальна-стылістычнай прыналежнасці.

Навуковы кіраўнік Я.Я. Іваноў– кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры англійскага, агульнага і славянскага мовазнаўства УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова"

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Крыніцы паходжання франкамоўных запазычанняў крылатых слоў складаюць надзвычай гетэрагенную сукупнасць і таму патрабуюць класіфікацыі. Іх можна размежаваць у першую чаргу на адзінкавыя і комплексныя.

2.1. Адзінкавыя крыніцы дыферэнцыруюцца на першасныя (арыгінальныя) і другасныя (неарыгінальныя).

2.1.1. Першасныя крыніцы паходжання маюць толькі франкамоўныя запазычанні крылатых слоў з уласна французскіх крыніц. Да гэтых крыніц адносяцца літаратурныя тэксты, фальклорныя творы, тэксты масавай камунікацыі, назвы твораў мастацтва, выказванні знакамітых асоб – гістарычных (дзяржаўных, палітычных, грамадскіх) дзеячаў, філосафаў, вучоных, пісьменнікаў, а таксама людзей з іх асяроддзя, мянушкі вядомых асоб і літаратурных герояў.

2.1.1.1. Літаратурныя крыніцы размяжоўваюцца на творы мастацкай літаратуры, эпісталярныя тэксты, публіцыстычныя творы, філасофскія творы, тэксты музычных твораў і інш.

1. **Мастацкія творы** розных відаў і жанраў як крыніцы крылатых слоў падзяляюцца, у сваю чаргу, на празаічныя, паэтычныя і драматычныя:

а) **празаічныя**:

– раман, напр.: *авечкі Панурга* або *панургавы статак* < *les moutons de Panurge* (Ф. Рабле, «Gargantua et Pantagruel», 1532); *грамадская думка* < *opinion publique* (Ж.-Ж. Русо, «Julie, ou la Nouvelle Héloïse», 1761); *дзяўчыны ў росквіце* < *jeunes filles en fleurs* (М. Пруст, «A la recherche du temps perdu», 1913–1927) і інш.;

– літаратурныя выслоўі, напр.: *Старыя таму так любяць даваць добрыя парады, што яны ўжо не могуць падаваць дрэнныя прыклады* < *Les vieillards aiment à donner de bons préceptes pour se consoler de n'être plus en état de donner de mauvais exemples* (Ф. дэ Ларошфуко, «Réflexions ou sentences et maximes morales», 1665); *Усе скардзяцца на сваю памяць, але ніхто не скардзіцца на свой розум* < *Tout le monde se plaint de sa mémoire, et personne ne se plaint de son jugement* (Ф. дэ Ларошфуко, «Réflexions ou sentences et maximes morales», 1665) і інш.;

б) **паэтычныя**:

– паэма, напр.: *Тое, што добра разумееш, ясна і выкажаш* < *і словы для гэтага лёгка знойдуцца*> < *Ce que l'on conçoit bien s'énonce clairement, Et les mots pour le dire arrivent aisément* (Н. Буало, «L'Art poétique», 1674) і інш.;

– літаратурная байка, напр.: *Мацнейшы заўсёды правы* < *La raison du plus fort est toujours la meilleure* (выслоўе з байкі Ж. дэ Лафантэна «Le Loup et l'Agneau» з першай кнігі «Fables», 1668) і інш.;

в) **драматычныя**:

– трагедыя, напр.: *бліскаць сваёй адсутнасцю* < *briller par son absence* (М.-Ж. Шэнье, «Tibère», 1805); *Дзень за днём да смерці бліжэй* < *Chaque instant de la vie est un pas vers la mort* (П. Карнель, «Tite et Bérénice», 1670) і інш.;

– драма, напр.: *Шукайце жанчыну!* < *Cherchez la femme!* (А. Дзюма-бацька, «Les Mohicans de Paris», 1864 і інш.);

– камедыя, напр.: *Есці, каб жыць, а не жыць, каб есці* < *Manger pour vivre et non pas vivre pour manger* (Ж.-Б. Мальер, «L'Avare», 1668); *за прыгожыя вочы* < *pour les beaux yeux* (Ж.-Б. Мальер, «Les Précieuses ridicules», 1660); *Мова дадзена чалавеку, каб выкладаць свае думкі* < *La parole a été donnée à l'homme pour expliquer sa pensée* (Ж.-Б. Мальер, «La Mariage forcé», 1664) і інш.;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– фарс[1], напр.: *Вернемся да нашых баранаў! < Revenons (retournons) à nos moutons!* (выслоўе з французскага фарса «Maistre Pierre Patelin», каля 1470) і інш.

2. **Эпісталярныя тэксты**, напр.: *Кожны народ мае той урад, якога заслугоўвае* або *Кожны народ мае такіх правіцеляў, якіх ён варты < Toute nation a le gouvernement qu'elle mérite* (выслоўе Ж. дэ Местрама, пасла Сардзінскага каралеўства пры рускім двары, з ліста ад 27 жніўня 1811 г., у якім паведамляецца аб новых законах, уведзеных расійскім імператарам Аляксандрам I); *Цяжкі толькі першы крок < Il n'y a (pas) que le premier pas qui coûte* (выслоўе з ліста маркізы дзю Дэфан дэ ла Ланд да Ж.Л. Даламбера ад 7 ліпеня 1763 г.) і інш.

3. **Публіцыстычныя творы**, напр.: *правы чалавека <і грамадзяніна> < les droits de l'homme et du citoyen* (выраз з «Déclaration des Droits de l'Homme et du Citoyen», прынятай 26 жніўня 1789 г., палітычнага маніфеста буржуазнай рэвалюцыі ў Францыі ў 1789–1794 гг., аўтарам якога з'яўляецца французскі святар і палітычны дзеяч Э.-Ж. Сьеес); *трэці свет < tiers monde* (выраз французскага сацыёлага, дэмографа і эканаміста А. Саві, які ён ужыў у артыкуле «Trois mondes, une planéte», надрукаваным у часопісе «L'Observateur» 14 жніўня 1952 г.) і інш.

4. **Філасофскія творы**, напр.: *права на працу < le droit au travail* (Ш. Фур'е, «Théorie des quatre mouvements et des destinées générales», 1808) і інш.

5. **Тэксты музычных твораў**:

– песня, напр.: *Хто быў нічым, той стане ўсім! < Nous ne sommes rien, soyons tout!* (Э. Пацье, «L'Internationale», 1871) і інш.;

– лібрэта, напр.: *Заўсёды вяртаюцца да свайго першага кахання* або *Старое каханне не ржавее < On revient toujours à ses premiers amours* (выслоўе з лібрэта Ш.-Г. Эцьена да оперы кампазітара Н. Ізуара «Joconde», 1814) і інш.

2.1.1.2. Фальклорныя творы (гістарычныя анекдоты і інш.), напр.: *<Пасля нас> хоць патоп! < Après nous le déluge!* (выслоўе з гістарычных анекдотаў XVIII ст. пра французскага караля Людовіка XV, які нібыта так адказаў на паведамленне аб эканамічных цяжкасцях у краіне, і пра яго фаварытку маркізу Ж.А. дэ Пампадур, якая сказала гэтую фразу ў 1757 г., каб суцешыць свайго венцаноснага каханка, засмучанага з прычыны паражэння франка-аўстрыйскага войска ад прускай арміі пры Росбаху 5 лістапада 1757 г. падчас сямігадовай вайны) і інш.

2.1.1.3. Тэксты масавай камунікацыі:

– дэвіз, заклік, лозунг, напр.: *Свабода, роўнасць, братэрства! < Liberté, égalité, fraternité!* (лозунг французскай буржуазнай рэвалюцыі 1789–1794 гг., упершыню афіцыйна зафіксаваны ў пастанове парыжскага палітычнага клуба кардыльераў ад 30 чэрвеня 1793 г.) і інш.;

– эпіграфіка, напр.: *невядомы салдат < soldat inconnu* (надпіс на помніках ахвярам першай сусветнай вайны ў Парыжы і ў Лондане, астанкі якіх былі пахаваныя 11 лістапада 1920 г. пад Трыумфальнай аркай у Парыжы, а пазней у Вестмінстэрскім абацтве ў Лондане; пасля другой сусветнай вайны тое ж было зроблена ў іншых краінах – помнікі невядомаму салдату ёсць і ў Беларусі) і інш.;

– мова афіцыйных рытуалаў, напр.: *Кароль памёр! Няхай жыве кароль! < Le roi est mort! Vive le roi!* (выслоўе з афіцыйнага рытуалу каралеўскага дому ў Францыі да пачатку XIX ст., якое выкарыстоўвалася пры абвяшчэнні змены каралёў у сувязі са смерцю аднаго і пачаткам праўлення іншага) і інш.

---

[1] Фарс (у г разумеецца як малы камічны жанр заходне-еўрапейскага сярэдневяковага тэатра, які дасягнуў росквіту ў XIV–XVI стст., перш за ўсё ў Францыі [4, с. 899].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2.1.1.4. Назвы твораў мастацтва (назвы літаратурных тэкстаў, твораў музычнага і выяўленчага мастацтва, кінафільмаў і г.д.), якія сталі крылатымі, размяжоўваюцца на наступныя.

1. **Назвы літаратурных тэкстаў**, напр.: *з кахання не жартуюць* < *«On ne badine pas avec l'amour»* (назва камедыі А. дэ Мюсэ, 1834); *небяспечныя сувязі* < *«Les Liaisons dangereuses»* (назва рамана Ш. дэ Лакло, 1782); *пытанне грошай* < *«Question d'argent»* (назва драмы А. Дзюма-сына, 1857); *сіняя птушка* < *«L'Oiseau bleu»* (назва п'есы-казкі М. Метэрлінка, 1908) і інш.

2. **Назвы кіна-, тэле- і мультфільмаў**, напр.: *плата за страх* < *«Le Salaire de la peur»* (назва мастацкага фільма французскага рэжысёра А.-Ж. Клузо, 1953) і інш.

2.1.1.5. Выказванні знакамітых асоб – гістарычных (дзяржаўных, палітычных, грамадскіх) дзеячаў, філосафаў, вучоных, пісьменнікаў.

1. **Дзяржаўных і палітычных дзеячаў**, напр.: *Дакладнасць – ветлівасць каралёў* < *L'exactitude est la politesse des rois* (выслоўе Людовіка XVIII, караля Францыі ў 1814–1824 гг.); *Дзяржава – гэта я!* < *L'état c'est moi* (выслоўе Людовіка XIV, караля Францыі ў 1643–1715 гг., якое ён сказаў на адным з пасяджэнняў парламента Францыі 13 красавіка 1655 г.) і інш.

2. **Грамадскіх дзеячаў**, напр.: *Адвага, адвага і яшчэ раз адвага* < *De l'audace, et encore de l'audace, et toujors de l'audace* (выслоўе з прамовы Ж. Дантона, аднаго з кіраўнікоў французскай буржуазнай рэвалюцыі 1789–1794 гг., у Грамадскім камітэце нацыянальнага выратавання 2 верасня 1792 г.) і інш.

3. **Філосафаў**, напр.: *Ад кожнага па магчымасцях, кожнаму па яго працы* < *A chacun selon sa capacité, à chaque capacité selon ses oeuvres* (выслоўе французскага філосафа К.-А. дэ Сен-Сімона); *дзіця прыроды* < *l'enfant de la nature* (выраз Ж.-Ж. Русо) і інш.

4. **Вучоных**, напр.: *Стыль – гэта чалавек* або *Які стыль – такі чалавек* < *Le style c'est l'homme* (выслоўе склалася на аснове выразу прыродазнаўца Ж.-Л. дэ Бюфона з прамовы ў Французскай акадэміі 25 жніўня 1753 г.: «Le style c'est l'homme même») і інш.

5. **Пісьменнікаў**, напр.: *каханне без крылаў* < *l'amour sans ailes* (выраз французскага пісьменніка В. Шэрбюлье) і інш.

2.1.1.6. Выказванні людзей з асяроддзя знакамітых асоб, напр.: *Уставайце, граф, вас чакаюць вялікія справы!* < *Levez-vous, monsieur le comte, vous avez de grandes choses à faire!* (выслоўе слугі французскага філосафа К.-А. дэ Сен-Сімона, якім ён штораніцы будзіў свайго гаспадара, пра што згадваецца ва ўспамінах сучаснікаў вучонага) і інш.

2.1.1.7. Мянушкі вядомых асоб і літаратурных герояў, напр.: *шэры кардынал* < *Eminence grise* (мянушка манаха-капуцына Жазэфа (Ф. Ле Клера дзю Трамбле), які насіў шэрую сутану і быў першым памочнікам французскага кардынала Рышэльё (А.Ж. дзю Плесі), істотна ўплываў на яго рашэнні, але ніколі не імкнуўся да асабістай папулярнасці) і інш.

2.1.2. Другасныя крыніцы паходжання крылатых слоў не з'яўляюцца арыгінальнымі. Крылатыя словы з другасных крыніц былі запазычаны, у сваю чаргу, з іншых літаратурных, фальклорных і г.д. тэкстаў (першакрыніц). Дзякуючы аўтарытэту аўтараў другасных крыніц і/або вядомасці іх твораў шыраковядомым такія выразы сталі шырокавядомымі і набылі «крылатасць». Пры гэтым звесткі аб першакрыніцы з'яўляюцца неактуальнымі (або ўвогуле невядомымі) для носьбітаў мовы (першая крыніца аказваецца забытай або напаўзабытай, паколькі выраз стаў вядомым дзякуючы свайму другаснаму выкарыстанню).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У якасці другасных крыніц паходжання могуць выступаць усе вызначаныя вышэй крыніцы (гл. **2.1.1.**).

Першакрыніцы тых выразаў, якія сталі крылатымі дзякуючы ўжыванню ў другасных крыніцах, могуць быць як уласна французскія, так і няўласна французскія.

2.1.2.1. Уласна французскія першакрыніцы складаюцца з тэкстаў вуснай гутарковай мовы, літаратурных твораў, выказванняў знакамітых асоб, мянушак вядомых асоб і літаратурных герояў і інш.

1. **Тэксты вуснай гутарковай мовы**, напр.: *<Добра> смяецца той, хто смяецца апошні (апошнім) < Rira bien qui rira le dernier* (выраз паходзіць з французскай прыказкі; быў ужыты ў п'есе англійскага пісьменніка Дж. Ванбру «The Country House», 1703; стаў шырокавядомым пасля выхаду ў свет байкі Ж.-П. дэ Фларыяна «Два селяніны і хмара», 1792); *дойная карова < vache à lait* (паходзіць з народнага выразу, вядомага таксама ў англійскай і нямецкай мовах, але з якой мовы паходзіць гэты выраз, дакладна невядома; стаў крылатым пасля выхаду ў свет камедыі Ж.-Б. Мальера, «Le Bourgeois gentilhomme», 1670; паўтораны ім у камедыі «Le Malade imaginaire», 1673) і інш.

2. **Літаратурныя творы**, напр.: *Апетыт прыходзіць у часе яды < L'appétit vient en mangeant* (выслоўе паходзіць з філасофскага трактата Ж. дэ Анжэ «Аб прычынах», 1515; стала шырокавядомым пасля выдання рамана Ф. Рабле «Gargantua et Pantagruel», 1532) і інш.

3. **Выказванні знакамітых асоб** – гістарычных (дзяржаўных, палітычных, грамадскіх) дзеячаў, філосафаў, вучоных, пісьменнікаў.

3.1. **Дзяржаўных і палітычных дзеячаў**, напр.: *Кожны французскі салдат носіць у сваім ранцы маршальскі жэзл < Tout soldat français porte dans sa giberne le bâton de maréchal de France* (выслоўе Напалеона Банапарта, імператара Францыі ў 1804–1815 гг., пра што згадваецца ў кнізе Э. Блаза «La vie militaire sous l'Empire», 1837; набыло крылатасць пасля таго, як яго ўжыў Людовік XVIII, кароль Францыі ў 1814–1824 гг., у сваёй прамове, звернутай да выхаванцаў ваеннай школы ў Сен-Сіры, 8 жніўня 1819 г.) і інш.

3.2. **Пісьменнікаў**, напр.: *Ад вялікага да смешнага адзін крок < Du sublime au ridicule il n'y a qu'un pas* (выслоўе французскага пісьменніка Ж.-Ф. Мармантэля; стала шырокавядомым пасля таго, як яго ўжыў Напалеон Банапарт, імператар Францыі ў 1804–1815 гг., у снежні 1812 г. падчас уцёкаў яго арміі з Расіі, пра што згадваецца ў кнізе французскага дыпламата і публіцыста Д.Д. дэ Прата «Histoire de l'ambassade dans le Grand-duché de Varsovie en 1812», 1816) і інш.

4. **Мянушкі вядомых асоб і літаратурных герояў**, напр.: *жалезная маска < le Masque de fer* (выраз паходзіць ад мянушкі таямнічага паланнага Бастыліі, які быў зняволены 18 верасня 1698 г. і памёр у турме 19 лістапада 1703 г.; стаў крылатым пасля выхаду на шырокі экран мастацкага фільма французскага рэжысёра А. Дэкуана «Le Masque de fer», 1962); *рыцар без страху і дакору < le chevalier sans peur sans reproche* (выраз паходзіць ад мянушкі французскага палкаводца Л. Трэмуйля, якога пры жыцці так называлі яго сучаснікі; набыў шырокую вядомасць пасля выдання кнігі пра французскага рыцара П. дзю Тэрайля Баярда «La très joyeuse, plaisante et récréative histoire du bon chevalier sans peur et sans reproche, gentil Seigneur de Bayart...», 1527) і інш.

2.1.2.2. Няўласна французскія першакрыніцы – гэта тэксты вуснай гутарковай мовы, літаратурныя творы, выказванні знакамітых асоб і інш.

1. **Тэксты вуснай гутарковай мовы**, напр.: *бура ў шклянцы вады < une tempête dans un verre d'eau* (выраз паходзіць з лацінскай прыказкі *Excitare fluctus in simpulo*, якую Цыцэрон ужыў у «De legibus», III, 16, 36; набыў крылатасць пасля выдання рамана

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

А. дэ Бальзака «Le Curé de Tours», 1832, дзе аўтарства прыпісваецца французскаму філосафу і дзяржаўнаму дзеячу Ш.Л. дэ Мантэск'ё); *Спяшайцеся павольна* < *Hâtez-vous lentement* (выслоўе паходзіць з лацінскай прыказкі *Festina lente*, якую згадвае рымскі гісторык Светоній як адзін з улюбёных выразаў Аўгуста, рымскага імператара ў 27 г. да н.э. – 14 г. н.э., у «Vitae XII imperatorum», кніга 2 «Vita divi Avgvsti», 25; стала шырокавядомым пасля выхаду ў свет вершаванага трактата Н. Буало «L'Art poétique», 1674) і інш.

2. **Літаратурныя творы**, напр.: *Адзін за ўсіх <і> ўсе за аднаго* або *Усе за аднаго і адзін за ўсіх* < *Tous pour un, un pour tous* (выслоўе паходзіць з паэмы У. Шэкспіра «The Rape of Lucrece», 1594; стала крылатым пасля выдання рамана А. Дзюма-бацькі «Les Trois Mousquetaires», 1844); *пачатак канца* < *voilà le commencement de la fin* (выраз паходзіць з камедыі У. Шэкспіра «A Midsummer Night's Dream», 1594; стаў шырокавядомым пасля таго, як быў ужыты ў гістарычным анекдоце XIX ст. пра французскага дыпламата Ш.М. дэ Талейрана, які так назваў пачатак другога праўлення ў Францыі імператара Напалеона Банапарта, што працягвалася толькі роўна «сто дзён» з 20 сакавіка па 22 чэрвеня 1815 г.) і інш.

3. **Выказванні знакамітых асоб** – гістарычных (дзяржаўных, палітычных, грамадскіх) дзеячаў, філосафаў, вучоных, пісьменнікаў, напр.: *Кароль валадарыць, але не кіруе* < *Le roi règne et ne gouverne pas* (выслоўе польскага дзяржаўнага дзеяча Я. Замойскага, якое ён сказаў у канцы сваёй прамовы на польскім сейме перад Сігізмундам III, каралём Рэчы Паспалітай у 1587–1632 гг.: «Regna, sed non impera»; стала крылатым пасля таго, як было ўжыта французскім дзяржаўным дзеячам А. Цьерам у артыкуле, надрукаваным у газеце «Le National» 4 лютага 1830 г.) і інш.

2.2. Комплексныя крыніцы паходжання крылатых слоў, запазычаных з французскай у беларускую мову, прадстаўлены сукупнасцю некалькіх крыніц, кожная з якіх з'яўляецца актуальнай для носьбітаў мовы. Можна вылучыць наступныя дыяхранічныя мадэлі комплексных крыніц.

2.2.1. Уласна французскія крыніцы + няўласна французскія крыніцы, напр.: *Чалавек нараджаецца свабодным <, а між тым ён усюды ў ланцугах>* < *L'homme est né libre, et partout il est dans les fers* (Ж.-Ж. Русо, «Du contrat social», 1762; Ф. Шылер, «Die Worte des Glaubens», 1798) і інш.

2.2.2. Уласна французскія крыніцы + няўласна французскія крыніцы (усяго 2), напр.: *жалезная заслона* < *le rideau de fer* (выраз французскага прэм'ер-міністра Ж. Клемансо з прамовы ў Палаце дэпутатаў Францыі 23 снежня 1919 г.; выраз нямецка-фашысцкага палітычнага і дзяржаўнага дзеяча Й. Гебельса, які ён ужыў у артыкуле «Das Jahr 2000», надрукаваным у часопісе «Das Reich» 23 лютага 1945 г.; выраз англійскага прэм'ер-міністра У. Чэрчыля з прамовы ў Вестмінстэрскім каледжы ў Фултане, ЗША, 5 сакавіка 1946 г., а таксама з яго тэлеграм ад 12 мая і 4 чэрвеня 1945 г. прэзідэнту ЗША Г. Труману; першапачаткова паходзіць з англійскага народнага выразу, які ўжываўся для абазначэння псіхалагічных пачуццяў адзіноты, замкнутасці і ўнікненне метафарычнага сэнсу якога звязана з выкарыстаннем у заходнееўрапейскіх тэатрах канца XVIII ст. жалезных заслон у супрацьпажарных мэтах) і інш.

2.2.3. Няўласна французскія крыніцы (усяго 4) + **уласна французскія крыніцы**, напр.: *Маё жыццё – барацьба* < *Ma vie est un combat* (выслоўе з твора Эўрыпіда «Supplices» – 551; выслоўе з твора Сенекі «Epistolae morales», 96, 5: «Vivere militare est»; выслоўе з лацінскага перакладу Св. Пісання 1546 г. «Biblia sacra vulgatae editionis», Iob, 7, I: «Militia est vita hominis»; выслоўе М. Лютэра: «Muss der Mensch immer im Streit sein auf der Erden?»; выслоўе з трагедыі Вальтэра «Le Fanatisme, ou Mahomet le prophète», 1736) і інш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Заключэнне

З агульнай колькасці франкамоўных запазычанняў крылатых слоў (каля 150 адзінак) у сучаснай беларускай літаратурнай мове з уласна французскіх крыніц паходзіць каля 91 % (137 адзінак), а з іншых крыніц – каля 9 % (12 адзінак).

Крыніцы паходжання крылатых слоў размяжоўваюцца на адзінкавыя і комплексныя. Адзінкавыя крыніцы дыферэнцыруюцца на першасныя (арыгінальныя) і другасныя (неарыгінальныя).

Першасныя крыніцы паходжання маюць толькі франкамоўныя запазычанні крылатых слоў з уласна французскіх крыніц (літаратурных і фальклорных твораў, тэкстаў масавай камунікацыі, назваў твораў мастацтва, выказванняў знакамітых асоб (ці людзей з іх асяроддзя), мянушак вядомых асоб і літаратурных герояў). Літаратурныя крыніцы размяжоўваюцца на творы мастацкай літаратуры (празаічныя – раман, літаратурныя выслоўі; паэтычныя – паэма, літаратурная байка; драматычныя – трагедыя, драма, камедыя, фарс), эпісталярныя, публіцыстычныя, філасофскія творы, тэксты музычных твораў.

Другасныя крыніцы паходжання крылатых слоў не з'яўляюцца арыгінальнымі. Першакрыніцы тых выразаў, якія сталі крылатымі дзякуючы ўжыванню ў другасных крыніцах, могуць быць як уласна французскія (тэксты вуснай гутарковай мовы, літаратурныя творы, выказванні знакамітых асоб і мянушкі вядомых асоб і літаратурных герояў), так і няўласна французскія (тэксты вуснай гутарковай мовы, літаратурныя творы і выказванні знакамітых асоб).

Комплексныя крыніцы паходжання крылатых слоў прадстаўлены трыма дыяхранічнымі мадэлямі: «уласна французскія + няўласна французскія», «уласна французскія + няўласна французскія (больш за 1)», «няўласна французскія (больш за 1) + уласна французскія».

Прапанаваная класіфікацыя крыніц паходжання франкамоўных запазычанняў крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове з'яўляецца адкрытай і можа ўдакладняцца і дапаўняцца.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Янкоўскі, Ф. Крылатыя словы і афарызмы (з беларускіх літаратурных крыніц) / Ф. Янкоўскі. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1960. – 135 с.

2. Крылатыя выразы ў беларускай мове. Ч. 1 : З іншамоўных (еўрапейскіх і амерыканскіх) крыніц XII–XX стст. : тлумачальны слоўнік / пад рэд. Я.Я. Іванова. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2004. – 136 с.

3. Крылатыя выразы ў беларускай мове. Ч. 2 : З рускамоўных літаратурных і фальклорных крыніц XII–XX стст. : тлумачальны слоўнік / пад рэд. С.Ф. Івановай. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2006. – 208 с.

4. Михайлов, А.Д. Фарс / А.Д. Михайлов / Краткая литературная энциклопедия : в 9 т. / гл. ред. А.А. Сурков. – М. : Советская энциклопедия, 1975. – Т. 7. – С. 899–901.

Tsepljakova A.D. **French Borrowed Winged Words in the Modern Belarusian Literary Language (the Amount and Etymological Sources)**

The article reveals the amount and sources of winged words borrowed from French into the modern Belarusian literary language. The etymological sources of the winged words are subdivided into simple (primary and secondary) and complex. Primary sources include borrowings of winged words from the French sources exclusively. These sources comprise pieces of literature (fiction, epistolary texts, publicism, philosophic works and the texts of musical pieces), folklore, texts of mass communication, names of artistic works, sayings of prominent people (or of the people belonging to their surroundings), nick-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

names of famous people and literary characters. Secondary sources (the texts of the spoken language, literary works, sayings of prominent people and names of artistic works) contributed to the spread of winged words from French and other sources. Complex (two or more) sources are represented by three patterns: "French + Non-French", "French + Non- French (more than 1)", "Non-French (more than 1) + French".

Матэрыял паступіў у рэдкалегію 17.05.2009

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова